Трапіўшы ў ізалятар, Даронін не губляў надзеі апынуцца на волі. Думаў, што яго выпусцяць пад падпіску аб нявыездзе, бо ўсё, што мог, следству ўжо паведаміў. Аднак аказалася, што "кампетэнтныя органы" ўжо мелі на яго матэрыял. "На відэа, якое было зроблена на Плошчы, бачна, што я наношу ўдары па шчытах, якімі быў забарыкадзіраваны Дом урада", — гаворыць хлопец. — Праўда, пазней на судзе яшчэ дадалося, што ў мяне ў руках быў нейкі жалезны прадмет, хоць гэта няпраўда... Ад суда я нічога добрага не чакаў, нават не таму, што гэта быў сапраўдны цырк, а таму, што ведаў: у турму мяне адправяць, без варыянтаў. Яшчэ перад перадачай справы ў суд дасведчаныя людзі з кампетэнтных органаў мне проста і даступна растлумачылі: усе фігуранты справы 19 снежня — закладнікі сітуацыі.

Тры з паловай гады турмы Дзмітрый Даронін павінен быў правесці ў калоніі "Віцьба-3", дзе зараз сядзіць прэс-сакратар Андрэя Саннікава Аляксандр Атрошчанкаў, а ў свой час знаходзіўся і Аляксандр Казулін.

"Праблем у мяне там ні з адміністрацыяй, ні з іншымі асуджанымі не было. На што падобная турма? Калі гаварыць, што гэта піянерлагер узмоцненага рэжыму, то ў гэтым ёсць пэўная доля праўды. Там да мяне ставіліся, як да ўсіх, не "прэсавалі", лісты з дому прыходзілі рэгулярна... З Сашам Атрошчанкавым мы, на вялікі жаль, амаль не кантактавалі — знаходзіліся ў розных атрадах..."

За час, што Дзмітрый правёў у турме, да яго на кароткатэрміновае спатканне прыязджала маці. "Яна не ўгаворвала мяне пісаць нейкіх просьбаў пра памілаванне, ды і я не збіраўся, настройваўся адбыць тэрмін", — прызнаецца Даронін. — Хаця, канечне ж, сумаваў па доме, па бацьках, братах, сёстрах, сябрах... Марыў аб шашлыках на прыродзе і рыбалцы..."

Але, як і іншых асуджаных па "справе за 19 снежня", Дароніна ўпарта прасілі напісаць прашэнне.

"Вось і ўявіце мой стан. Дома маці з дзецьмі, хворы бацька, а я ў турме... Нават усведамляючы гэта, я не збіраўся нешта пісаць... Проста не хацеў быць першым. Пасля вызвалення дзевяці чалавек усё ж такі вырашыў, што родным я патрэбны дома, а не ў турме... І я не сустрэў чалавека, які б мяне за гэта асудзіў. У памілаванні прыйшлося напісаць, што я прызнаю сябе вінаватым, інакш бы проста не выпусцілі, хаця на судзе віны сваёй я не прызнаў цалкам... Яшчэ раз паўтаруся: усе асуджаныя за 19 снежня — закладнікі сітуацыі".

Вярнуўшыся дадому, Дзмітрый Даронін распачаў пошук працы.

"Пакуль я яе не знайшоў, але абавязкова спраўлюся, я ўпарты. Ёсць думкі працягнуць адукацыю. У мяне за спінай пакуль толькі ПТВ, але мяне вабіць эканоміка. Мару атрымаць эканамічную адукацыю, бо ведаю — новай Беларусі спатрэбяцца добрыя эканамісты", — гаворыць хлопец.

У самым фінале нашай з ім размовы ён заўважыў: "Турма зрабіла мяне іншым чалавекам. Я стаў больш загартаваным... Усё, што было са мной пасля Плошчы, — гэта нездарма. Веру, што рана ці позна беларусы ўздымуцца, бо так, як мы жывём зараз, жыць нельга..."

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

З-ЗА КРАТАЎ

## *Алена ЛІХАВІД: «Людзі там зведзены да стану рабоў...»*

*Днямі маці палітвязня Мікіты Ліхавіда атрымала ліст ад сына, які ўжо больш за месяц застаецца ў памяшканні камернага тыпу.*

Як распавяла спадарыня Алена, Мікіта, як звычайна, не скардзіцца ні на ўмовы ўтрымання, ні на здароўе, піша, што ў яго ўсё добра. "Калі сын трапляе ў турму, пачынаеш радавацца самым элементарным рэчам — што ён мае магчымасць чытаць кнігі і прэсу, пісаць лісты, што спіць на матрацы. У ШЫЗА ён усяго гэтага быў пазбаўлены", — гаворыць Алена Ліхавід. Яна гаворыць, што падрабязнасці пра ўтрыманне сына ў карцары ёй сталі вядомыя выпадкова, бо сам Мікіта, каб не засмучаць маці, нічога ёй не распавядае.

З перавагаў прабывання ў карцары Алена Ліхавід адзначае тое, што ейнаму сыну дазволена набываць у турэмнай краме харчоў на 35.000 руб. на месяц. Але адразу ж дадае, што на гэтыя грошы за цяперашнія кошты набыць можна хіба цюбік зубной пасты. "Нават і на тыя 170.000 руб., што дазволена выдаткоўваць тым, хто не парушае рэжыму, асабліва не разгонішся — палка каўбасы ў турэмнай краме каштуе пад 100 000 руб.", — зазначае яна.

Алена Ліхавід наведала Дэпартамент выканання пакаранняў з просьбай павысіць зняволеным грашовыя нормы на закупы. Але чыноўнікі ёй паведамілі, што нормы могуць змяніцца толькі пасля падпісання ўказа прэзідэнта. А да таго адпаведныя змены маюць быць унесены ў закон і зацверджаны дзвюма палатамі беларускага парламента. "Карацей, гэта доўгая песня. Іх там зусім не цікавіць, што людзі, няхай і за кратамі, зведзены да стану рабоў. А ёсць жа вязні, якім з дому не дасылаюць ні грошай, ні пасылак. Яны вымушаны існаваць на тыя грошы, што атрымліваюць за працу ў калоніі. А якія там заробкі, вы ж ведаеце, у найлепшым выпадку 5000—7000 руб.", — абураецца жанчына.

У дваццатыя дні верасня Алена Ліхавід збіраецца наведаць сына — Мікіту дазволілі адно кароткатэрміновае спатканне са сваякамі. З памяшкання камернага тыпу вязень выйдзе ў кастрычніку. Звяртацца з прашэннем аб памілаванні хлопец не збіраецца. "Навошта невінаватаму памілаванне — не бачу логікі?" — напісаў Мікіта ў лісце да маці.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## *Някляеву забаронена пакідаць межы Мінска*

*Нагадаем, што ў суд палітык павінен быў з'явіцца ў мінулую пятніцу. Ён прыйшоў да будынка Ленінскага суда Мінска, але ўнутр на знак пратэсту заходзіць не стаў.*

Ён зазначыў, што прайшло ўжо дзевяць месяцаў з моманту "брутальнага задушэння мірнай акцыі 19 снежня 2010 года ў Мінску". "Вынікам гэтых дзеянняў стала міжнародная ізаляцыя Беларусі і катастрафічны эканамічны крызіс, выйсця з якога ўлада знайсці не можа, — канстатаваў Някляеў. — Я неаднаразова заяўляў і ў судзе, і пасля яго, што толькі шляхам дыялогу са сваімі апанентамі і грамадзянскай супольнасцю можна выйсці з той сітуацыі, у якую яна сябе загнала. Замест гэтага ўлада працягвае рэпрэсіі нават у дачыненні да тых людзей, якія па-за палітыкай, напрыклад адвакатаў, што абаранялі ўдзельнікаў падзей 19 снежня".

"Аднак я не пайду ў суд не толькі з-за гэтай прычыны, — падкрэсліў Някляеў. — Я не пайду туды ў знак пратэсту супраць рэпрэсій і ў знак салідарнасці з усімі палітзняволенымі, якія знаходзяцца зараз у турмах. Яны павінны быць рэабілітаваны і неадкладна вызвалены. Улада павінна прыняць палітычнае рашэнне, калі яна хоча, каб яе паважалі і хадзілі ў суды".

Пасяджэнне, на якім вырашалася, якія дадатковыя абмежаванні накласці на "асуджанага Някляева", прайшло без яго ўдзелу. У выніку суд задаволіў хадайніцтва міліцыі аб тым, каб Някляеву было забаронена пакідаць межы Мінска, наведваць сходы і мітынгі. Ён таксама павінен раз на тыдзень адзначацца ў міліцыі, а з 20.00 да 6.00 знаходзіцца дома. Толькі ў адным хадайніцтве было адмоўлена — Някляеў, па рашэнні суда, усёткі можа наведваць установы, дзе на разліў прадаюць спіртное. Іншымі словамі — рэстараны, бары, кавярні.

Міліцыя хацела забараніць і гэта.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

## *Суд за кратамі*

*Зміцера Дашкевіча зноў будуць судзіць. Пра гэта стала вядома пасля таго, як адвакату маладзёжнага актывіста прыйшло паведамленне, у якім пазначана, што 13 верасня ў калоніі адбудзецца судовае пасяджэнне.*

Паплечнікі Зміцера мяркуюць, што суд прызначаны для таго, каб разглядзець пытанне змены месца пакарання для Дашкевіча, які з'яўляецца "злосным парушальнікам рэжыму ўнутранага ўтрымання". Нагадаем, што актывісты і праваабаронцы нядаўна нават правялі прэс-канферэнцыю, падчас якой паведамілі пра ціск на Дашкевіча і пра метады, з дапамогай якіх з хлопца робяць злоснага парушальніка.

Як лічыць нявеста Зміцера Наста Палажанка, судовае пасяджэнне ў калоніі ладзіцца, каб перавесці Дашкевіча ў "крытку" — турму, умовы зняволення ў якой больш жорсткія, чым у калоніі агульнага рэжыму.

ПРОЕКТЫ

## *Иранский бизнес заставит белорусов полюбить баранину*

*Иран заинтересован в том, чтобы вкладывать инвестиции в белорусское сельское хозяйство.*

Это еще раз было подтверждено в ходе визита в Беларусь иранской делегации во главе с руководителем парламентской комиссии по аграрным вопросам Ирана Аббасом Раджаеи.

Из конкретных проектов, которые озвучены, можно выделить три. Готовятся документы о приобретении иранскими инвесторами 80 процентов акций ОАО "Вишневка-2010", принадлежащих Минскому райисполкому. Как известно, хозяйство расположено прямо под Минском, поэтому можно говорить о крайне удачной покупке иранскими партнерами дорогой земли.

Обсуждается также вопрос о приобретении акций ОАО "Хотляны" Узденского района. А в Логойском районе иранские инвесторы уже получили в пользование сроком на 99 лет почти три тысячи гектаров земель для строительства овцеводческой фермы.

По сведениям "Народной Воли", инвестиционный проект по созданию овцеводческого комплекса на 10 тысяч голов будет реализован в деревне Корень, где в этом году было зарегистрировано СООО "ИСТЕРН ШИП".

Кстати, согласно статистике, белорусская отара сейчас составляет всего около 50 тысяч голов, в основном это животные, которых держат на частных подворьях. Овец в Беларуси массово не разводили никогда, и традиционно считалось, что разведение овец в нашей стране нерентабельно. Иранские бизнесмены решили доказать обратное. И обещают накормить бараниной не только белорусов, но и экспортировать мясо в арабские государства.

**Олег СНОВ.**

# БАТЭ нарасхват

*Адзіночныя білеты на матчы барысаўскага БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў у продажы могуць не з'явіцца наогул...*

За пяць дзён рэалізацыі білетаў на матчы барысаўскага БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў прададзена больш за 13 тысяч квіткоў...

Квіткі на хатнія гульні групавога этапа Лігі чэмпіёнаў паміж БАТЭ і іспанскай "Барселонай", італьянскім "Міланам", а таксама чэшскай "Вікторыяй" паступілі ў касы стадыёнаў у Барысаве і Мінску 8 верасня.

Спачатку білет вырашылі прадаваць "пакетамі" — адразу на тры матчы. У продажы з'явіліся пакеты коштам 190, 400 і 700 тысяч рублёў.

Ажыятаж, які прагназаваўся напярэдадні рэалізацыі квіткоў, апраўдаўся цалкам...

У першы ж дзень іх продажу чарга жадаючых на ўласныя вочы ўбачыць супрацьстаянне падначаленых Віктара Ганчарэнкі з грандамі сусветнага футбола расцягнулася на сотні метраў — ад саміх кас стадыёна "Дынама", што на Кірава, да скрыжавання з вуліцай Свярдлова. Людзі запасаліся тэрмасамі з гарбатай і займалі чаргу з ночы.

Верагодна, трымаючы ў памяці спекуляцыю білетамі на матчы БАТЭ ў сезоне-2008/2009, калі барысаўчане ўжо гулялі ў групавым этапе Лігі чэмпіёнаў, сёлета было прынята рашэнне больш за два білетныя пакеты ў адны рукі не прадаваць...

Учора днём карэспандэнт "Народнай Волі" наведаў касы стадыёна "Дынама". Ажыятажу ўжо няма, але, па шчырасці, і квіткоў на добрыя месцы таксама. У продажы па-ранейшаму квіткі розных цэнавых катэгорый: ад 190 да 700 тысяч рублёў, аднак толькі на ніжнія рады. Жадаючых назіраць за гульнёй, гледзячы ў патыліцы міліцыянераў, якія будуць сачыць за парадкам у сектарах, няшмат...

У касах барысаўскага стадыёна карэспандэнту "Народнай Волі" сказалі, што ажыятаж назіраўся ў першыя дні, а зараз купіць білетны пакет на гульні БАТЭ можна абсалютна вольна. Праўда, ахвочых таксама няшмат...

Згодна з папярэдняй інфармацыяй, "адзіночныя" білеты на матч БАТЭ — "Барселона" павінны з'явіцца ў касах барысаўскага гарадскога стадыёна і стадыёна "Дынама" 24 верасня. Аднак да той пары іх можа не застацца, калі будуць рэалізаваны ўсе білетныя пакеты...

Дарэчы, сёння, 13 верасня, БАТЭ правядзе першы матч групавога этапа Лігі чэмпіёнаў супраць чэшскай "Вікторыі". Пачатак сустрэчы - у 21.45.

**Кастусь ЛІПСКІ.**

*Аляксандр КЛАСКОЎСКІ*



БЕЗ РУЖОВЫХ АКУЛЯРАЎ

# Пральная машына Ярмошынай

Беларускія ўлады, трапіўшы як сучка ў паркан, не пакідаюць спробаў выдаць чорнае за белае, у прыватнасці — адмыць мінулыя прэзідэнцкія выбары. Гэтым разам кнопку прапагандысцкай пральнай машыны націснула небезвядомая кіраўніца Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.

Мітусня тлумачыцца тым, што наверсе ўсё вастрэй адчуваюць дэфіцыт легітымнасці. Рэйтынг правадыра ўпаў ніжэй за калена: паводле даных НІСЭПД (зарэгістраваны ў Літве) — да 29,3% у чэрвені, і піке найхутчэй што доўжыцца. Удумайцеся, асэнсуйце: Лукашэнка сёння дэ-факта — прэзідэнт меншасці. Звыш таго, Захад яго працягвае байкатаваць, абрабаваны народ бурчыць і закіпае... Вось і закруціліся высокія начальнікі, як уюны на патэльні.

Раз-пораз Лукашэнка спрабуе ўкінуць тэзу, што да саміх выбараў, маўляў, у заходнікаў прэтэнзій няма, усё ўпіраецца ў праблему "так званых палітвязняў". У тую ж дудку дзьме і яго падначаленая Ярмошына, што дала днямі вялікае інтэрв'ю агенцтву "Інтэрфакс-Захад".

Перад прэзідэнцкімі выбарамі "*на 90% мы выканалі рэкамендацыі АБСЕ*", запэўнівае кіраўніца ЦВК. Сапраўды, напаказ Еўропе былі прыняты два вазы і цэбар дробных паправак у выбарчае заканадаўства. Кшталту дазволу кандыдатам мець свае фінансавыя фонды. Але ж тое каціныя слёзы — на лічаныя хвіліны тэлерэкламы ў прайм-тайм.

Дарэчы, наконт СМІ. Эфірныя квоты для апазіцыйных кандыдатаў — мізэр на фоне татальнай прапаганды за дзейнага кіраўніка. Каб людзі рабілі сапраўды свядомы выбар, медыйны плюралізм мусіць быць пастаянным, а не раз на пяцігодку.

Ды і ў іншых прынцыповых пытаннях — уключэнне апазіцыі ў выбаркамы, празрысты падлік галасоў — беларускі рэжым сказаў "ад вінта!".

Заканадаўчыя навацыі — кшталту квоты для партый і грамадскіх арганізацый на трэць месцаў у выбаркамах — ператварылі ў здзек. Практычна пад завязку запоўнілі тыя квоты прадстаўнікамі лаяльных, бутафорскіх арганізацый.

Паводле звестак кампаніі "За справядлівыя выбары-2010", падчас апошніх выбараў ва ўчастковыя камісіі апазіцыйнымі партыямі ды рухамі было вылучана 1073 прадстаўнікі, з іх уключылі толькі 183, або 17%. Між тым ад праўладных структур прайшло 93%. Ад "Белай Русі", напрыклад, каля чатырох тысяч чалавек! У выніку апазіцыянеры склалі ва ўчастковых выбаркамах нейкія смешныя долі працэнта.

У фарс ператварылі і назіранне. Дарэчы, падчас гульняў з Еўропай, напрыканцы 2009 года, нават ЦВК прапаноўваў пашырыць паўнамоцтвы назіральнікаў. Але супраць выступіў сам Лукашэнка: *"Я не бачу тут праблемы. У нас старшыня выбарчай камісіі на месцы вырашае, каго дапускаць да падліку галасоў, а каго не дапускаць"*.

Пры гэтым пані Ярмошына малюе драматычнае палатно: маўляў, рэверансаў у бок Захаду *"зрабілі столькі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, што ў выніку стварылі цяжкія ўмовы для працы саміх выбарчых камісій. Гаспадаром у гэтым выпадку пачуваўся не старшыня камісіі, а дробны палітычны авантурыст, які тэрарызаваў участковую камісію*".

Бедная вертыкаль, як яна толькі вытрымала гэты здзек з боку "адмарозкаў"!

Для параўнання. Пазалетась аўтар гэтых радкоў, асвятляючы выбары ў нямецкі бундэстаг, пераканаўся: там назіраць за падлікам бюлетэняў можа ўвогуле любы ахвотны, не паказваючы ніякіх пасведчанняў. Ды што там Германія! Мы бачым па тэлевізары, як нават у самых занядбаных афрыканскіх краінах усе бюлетэні высыпаюцца на стол і кожны паасобку дэманструецца прысутным.

Беларусі тут далёка да Афрыкі. Па-першае, пры падліку бюлетэняў назіральнікі часта бачаць толькі, мякка кажучы, заднія часткі тулава членаў камісій. Па-другое, нават самі члены камісій не ведаюць усёй арыфметыкі па ўчастку, бо кожнаму даюць лічыць толькі асобны стосік.

Яшчэ адна вынаходка ўладаў — расцягнутае аж на пяць дзён добраахвотна-прымусовае датэрміновае галасаванне, вынікі якога асабліва цяжка адсачыць (а калі пашэнціць, то яны, бывае, аказваюцца дыяметральна процілеглымі арыфметыцы асноўнага дня). На апошніх прэзідэнцкіх выбарах датэрмінова ўкінулі бюлетэні 23,1% беларускіх грамадзян. Цікавы штрых: прыкладна настолькі ж адрозніваюцца лічбы галасавання за Лукашэнку па афіцыйнай версіі і паводле замераў незалежных сацыёлагаў.

Пані Ярмошына і яе сатэліты любяць ківаць на Захад: маўляў, і там галасуюць загадзя! Сапраўды, на тых самых парламенцкіх выбарах у Германіі на ўчастку, дзе мне давялося быць, каля чвэрці выбаршчыкаў прагаласавалі датэрмінова. Але — увага! — там гэта робяць па пошце, і ўсе канверты распячатваюцца непасрэдна ў дзень выбараў роўна а 15-й гадзіне перад вачыма назіральнікаў. Адчуваеце розніцу?

Дарэчы, сёння беларускае кіраўніцтва пачынае новую гульню з Захадам. І, магчыма, хоча навязаць торг вакол прапарцыянальнай сістэмы на парламенцкіх выбарах. Бо частка аналітыкаў прытрымліваецца спрошчанага погляду: маўляў, выбары паводле партыйных спісаў — гэта лепей для апазіцыі. Яно так, але толькі пры ўмове, што самі выбары ёсць выбарамі, а не фарсам.

У іншым жа выпадку аўтарытарная ўлада сама вырашае, якім партыям наканавана перадолець бар'ер ды трапіць у парламент. Напрыклад, пераход на прапарцыянальную сістэму ў Казахстане нікольні не пахіснуў пазіцыі аўтакрата Назарбаева. Ды і ў Расіі з яе "кіраванай дэмакратыяй" загадзя вядома, каго пусцяць у Думу, а хто "не праханжэ". Там хоць трэсні, а ўраджай мандатаў збярэ "Единая Россия". У нас на такую ролю рыхтуюць "Белую Русь".

Карацей, інтэрв'ю Ярмошынай пад загалоўкам "Выбары ў парламент пройдуць паводле дзейнага заканадаўства" можна трактаваць і як намер Мінска падчапіць Еўропу на вуду. Каб брусэльскія стратэгі пачалі ўпрошваць: ну зрабіце, зрабіце выбары па партыйных спісах! Тут могуць паламацца ды згадзіцца, падаўшы гэта як фантастычны прагрэс. А ў выніку месцы ў Палацы падзеляць між "Белай Руссю" (ільвіная доля) ды парай марыянеткавых псеўдаапазіцыйных партый. Для дыктатуры ж тым часам размарозяць заходнія крыніцы фінансавання.

Ярмошына ўскладае віну за брутальны фінал мінулых выбараў на тых, каму трэба было *"пахаваць перамогу Аляксандра Лукашэнкі"*. Але ж хіба не пахавалі канчаткова тую піраву перамогу самі ўлады, абваліўшы эканоміку? Дзе славутыя 500 долараў?

Нават учарашнія "застабілы", у якіх вочы на лоб палезлі ад цэннікаў, клянуць зараз былога куміра. Так што няўклюдныя спробы адмыць мінулыя выбары можна рэзюмаваць выслоўем: паможа вароне мыла, як мерцвяку кадзіла.

ЭКСПЕРТИЗА

# Беларусь не попала в рейтинг конкурентоспособности экономик

*Всемирный экономический форум (ВЭФ) 7 сентября опубликовал "Глобальный рейтинг конкурентоспособности" на 2011—2012 год. Возглавляет список Швейцария, затем идут Сингапур, Швеция, Финляндия и США. Всего здесь представлены позиции 142 стран, последние места заняли Чад, Гаити, Бурунди, Ангола и Йемен. Беларусь в рейтинг не вошла.*

Страны СНГ в целом улучшили свои позиции. Выше всех среди стран Содружества независимых государств в списке находится Азербайджан — он поднялся на две строчки и занял 55-е место. Следующей названа Россия — она оказалась на 66-м месте, опустившись на три позиции. Казахстан стал третьим по СНГ и остался 72-м. Украина поднялась на семь позиций (до 82-й строчки), Армения — на шесть (до 92-й), Таджикистан — на 11 (до 105-й).

"Глобальный отчет о конкурентоспособности 2011—2012 годов выходит на фоне многочисленных проблем в мировой экономике и продолжающегося изменения баланса экономической активности от стран с развитой экономикой и в сторону развивающихся рынков. Политики пытаются найти способы управления нынешними экономическими проблемами, пока подготавливают свои экономики, чтобы они хорошо функционировали на более сложном глобальном ландшафте, и отчет предлагает уникальный инструмент для решения некоторых ключевых вопросов", — отметили создатели рейтинга.

"В первой десятке доминируют страны Северной и Западной Европы — это Швеция (третье место), Финляндия (четвертое), Германия (шестое), Нидерланды (седьмое), Дания (восьмое) и Великобритания (десятое). Япония, по-прежнему занимая второе место среди азиатских экономик, оказалась на девятом месте, несмотря на падение на три строчки в сравнении с прошлым годом", — проинформировали они.

ВЭФ составляет рейтинг конкурентоспособности, учитывая более чем 110 показателей, — инфраструктуру, эффективность рынков товаров и труда, качество образования и здравоохранения, макроэкономическую обстановку в стране, инновации, развитие финансового рынка и т.д.

Несмотря на то что Беларусь в списке не упоминается, государственное информационное агентство БЕЛТА указало, что республика заняла в нем 27-е место. Такая публикация появилась на сайте агентства, однако позже ее удалили. На самом деле эту позицию занимают Объединенные Арабские Эмираты.

ГОЛАС З НАРОДА

# За кулісамі візітаў...

*Не забываюць наведваць г.п.Гарадзея, што ў Нясвіжскім раёне, важныя асобы краіны. Зусім нядаўна Гарадзейскі цукровы камбінат наведваў Аляксандр Рыгоравіч. Надоўга застанецца ў памяці яго прыезд. Перад яго візітам лажылі новы асфальт у дождж, абнаўлялі дарожную разметку, малявалі фарбай усё, што толькі можна, забаранілі рынак у дзень прыезду і г.д. Неяк было нават няёмка, што ён выпацкае дарагі касцюм у свежую фарбу, але пасля ўспомнілася, што яму заўсёды накідваюць на плечы белы халат. Але, самае галоўнае, пасля яго візіту моцна падаражэў цукар.*

У апошнюю сераду жніўня Гарадзею наведаў М.У.Мясніковіч. Вельмі няўдалы дзень яны пастаянна выбіраюць для паездкі. Бо адзін раз на тыдзень, у сераду, у Гарадзеі, непадалёк ад цукровага камбіната, збіраецца невялікі рынак. Але мясцовыя чыноўнікі забараняюць у гэты дзень гандляваць, каб не перашкаджалі важным асобам. Прыходзіцца людзям зноў чакаць цэлы тыдзень, да наступнай серады, каб купіць сёе-тое.

Відавочна, важныя асобы баяцца людзей, калі перад іх прыездам робіцца "зачыстка". Чаму наш зямляк, кіраўнік урада Міхаіл Уладзіміравіч Мясніковіч не жадае наведаць мясцовы рынак, пацікавіцца коштамі на тавары, пагутарыць з людзьмі? Можа, яму было няёмка сустракацца з землякамі, бо якраз у гэты дзень павысіліся адпускныя цэны на мяса, ужо трэці раз за месяц?

Хацелася б запрасіць яго ў "Трактиръ", што знаходзіцца пры рынку. Была б нагода пасядзець за куфлем піва, пагутарыць пра жыццё, паглядзець праз акно на вялізныя чэргі пенсіянераў за курынымі шыйкамі і страўнікамі, ліверная каўбасой. Магчыма, Мясніковіч прыехаў, каб дакладна глянуць на тое, чаго недагледзеў Аляксандр Рыгоравіч? Вельмі дзіўна, што яны стала ездзяць па адным маршруце: цукровы камбінат — агракамбінат "Сноў". Ніхто з іх не зазірнуў на льнозавод, у школы, не наведаў лазні ў Гарадзеі і ля цукровага камбіната, не пабываў у мясцовых крамах, не праехаў па пабочных вуліцах.

Кожны разумее, чаму Мясніковіч паедзе ў Сноў: 61 год таму ён жа тут нарадзіўся. Такі заняты чалавек: то ён у Маскве, то ў Ізраілі, а на радзіму няма нагоды прыехаць. Здавалася, што ён паедзе ў вёскі Стаўпішча, Макашы, каб паглядзець на "нясвіжскі Скансэн", пацікавіцца будаўніцтвам турыстычнага аб'екта ў Макашах "Вадзяны млын", які пачынаў будаваць Леанід Фёдаравіч Крупец, ураджэнец гэтай вёскі. Але была надзея: нічога, вечарам па Беларускім тэлебачанні ўбачым, дзе пабываў наш вядомы зямляк, паколькі аўтамабіль АНТ быў у Гарадзеі. Але дзе там! З экрана не сыходзіць Аляксандр Рыгоравіч. Толькі ў бягучым радку адно паведамленне: "Гарадзейскі цукровы камбінат да канца года адчыніць цэх цукровай пудры". Гэта паведамленне насцярожыла: ці не стане зноў цукар даражэйшым пасля візіту Мясніковіча?

**Яўген СТУЖЫНСКІ.**

*г.Нясвіж.*

## 13 из 180

Как известно, государство подготовило к продаже 244 предприятия. Из них 180 пойдут с молотка в этом году.

Так должно быть по намеченному плану. Но вот вопрос — станет ли это реальностью?

На днях первый заместитель председателя Государственного комитета по имуществу Сергей Пятков обнародовал такие цифры. Пока продано 13 фабрик и заводов на 44 с лишним миллиарда рублей.

Если исходить из того, что за весь прошлый год было продано всего 5 предприятий, то цифра 13 как бы впечатляет. Но на фоне другой цифры — 180 — она выглядит блекло.

Почему приватизация идет со скрипом? На этот вопрос чиновники не любят рассуждать.

**Вера МАЦКЕВИЧ.**

ЧЫТАЧ—ГАЗЕТА

## Што гэта за Дзень беларускай вайсковай славы?

*У першыя дні верасня не аднойчы на беларускамоўных сайтах у інтэрнэце натыкалася на напамін, што 8 верасня — Дзень беларускай вайсковай славы. Патлумачце, калі ласка, што гэта за "неафіцыйнае свята".*

**Вера Ілюшына, г.Гомель.**

8 верасня 1514 года адбылася Аршанская бітва, у якой войска Вялікага Княства Літоўскага перамагло амаль утрая большую па колькасці армію Маскоўскай дзяржавы.

30-тысячнае войска ВКЛ пад камандаваннем гетмана Канстанціна Астрожскага літаральна разграміла маскоўскія палкі, агульная колькасць якіх перавышала 80 тысяч. Пад Оршай гетман Астрожскі ўпершыню ў вайсковай гісторыі выкарыстаў артылерыйскі залп з засады. Гэта і адыграла рашаючую ролю ў ходзе бітвы. У тагачаснай Еўропе Аршанская бітва стала адной з найбуйнейшых, а для беларускай вайсковай гісторыі — увогуле самай значнай перамогай.

У сувязі з гэтым з пачатку 1990-х гадоў мінулага стагоддзя 8 верасня ў Беларусі неафіцыйна адзначаецца як Дзень беларускай вайсковай славы.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

## Словы на вецер

***8 кастрычніка апазіцыя мае намер правесці Народны сход, каб выказаць прэтэнзіі ўладзе. У якасці альтэрнатывы кіраўнікі некаторых грамадскіх арганізацый і палітычных партый заклікаюць правесці Усебеларускі з'езд патрыятычных сіл — у падтрымку ўлады.***

*Ніякіх змен няма ў калгасе,*
*Эпоха бачыцца пустой...*
*Ён нібы ўвесь застыў у часе,*
*Які і назву меў — застой.*
*Усё, як колісь: "бітвы", планы*
*І пераходныя сцягі...*
*Між тым калгас быў занядбаны —*
*Душылі немач і даўгі.*
*Народ стагнаў ад гэткай долі*
*І кляў ён лёс няшчасны свой.*
*Усё, што зарабляў у полі,*
*Ішло на ежу і прапой.*
*І толькі меў турботаў мала*
*Важак — калгасны старшыня.*
*Яшчэ з ім разам жыравала*
*Уся прыўладная гайня:*
*Прафорг, бухгалтар, ідэолаг —*
*"Бамонд", гурмы мясцовай "цвет".*
*На джыпах гойсалі па сёлах —*
*Вось так паказвалі імпэт...*
*А вечарам, адчуўшы стому*
*(Быў дзень у іх такі цяжкі!),*
*Цыцкатых жонак бралі з дому*
*І ехалі на шашлыкі.*
*Народ, вядома ж, гэта бачыў,*
*І выспявала ў людзях злосць.*
*— Яны там ладзяць "пір сабачы",*
*А пасля іх нам — толькі косць.*
*Каб ім сказаць у вочы словы*
*Пра хлеб нішчымны, пра прыгнёт,*
*Рашыў аднойчы люд вясковы:*
*— Народ!*
*Збіраемся на сход!*
*Пра сход народны чуткі-згадкі*
*Дайшлі да вуха старшыні.*
*І быў настрой ягоны гадкі:*
*Прагоняць, божа барані.*
*Калгасны бос сабраў нараду —*
*Увесь свой доблесны актыў.*
*— Дык як нам даць халопам рады?*
*І што рабіць, каб гнеў астыў?*
*Сказаў бухгалтар:*
*— Участковы —*
*Наш чалавек. Ці ёсць сумнеў,*
*Што ён дубінкаю гатовы*
*Развеяць той "народны гнеў"?*
*Такая ж думка ў інжынера:*
*— Ды дысцыпліны дух аслаб!*
*Суровыя патрэбны меры...*
*Паклікаць можна і АМАП.*
*— Астыньце трохі, губашлёпы! —*
*Абсек іх бос. — А што, калі*
*Яны, бязмозглыя халопы,*
*За дошкі возьмуцца й калы?*
*Застыў на тварах жах і сполах*
*І быў ва ўсіх мярзотны стан,*
*Пакуль прайдоха-ідэолаг*
*Актыву свой не выклаў план...*
*...Бурлілі вёскі дзень каторы.*
*Настаў, нарэшце, "страшны суд",*
*І да калгаснае канторы*
*Пачаў сцякацца просты люд.*
*Аднак не вераць вочы яве,*
*Мяжы здзіўленню не відно,*
*Бо месца гэтае на справе*
*Ужо занятае даўно.*
*Наспех узведзена трыбуна,*
*Ёсць рэпрадуктар, мікрафон.*
*Якісь натоўп стаіць табунна,*
*Хоць не шматлікі надта ён.*
*Там актывісты-педагогі —*
*Асветнікі народных мас*
*(Далі загад ім вельмі строгі*
*Прыйсці сюды ў належны час).*
*Там новы "камсамол" так званы,*
*Што заўтра "стане ля руля".*
*Яшчэ і іншы люд нязнаны,*
*Відаць, прывезены здаля.*
*Во задалі работы клёку!*
*Дык дзе ж цяпер праводзіць сход?*
*Да фермы, што непадалёку,*
*Падаўся просты ўвесь народ.*
*Гучалі заклікі на сходзе:*
*— Далоў праўленне! Старшыні*
*Дурыць галовы людзям годзе!*
*Няма даверу больш ані!*
*Але ніхто не чуў прамоўцу,*
*Хоць ён зусім не пустазвон,*
*Бо ля канторы на ўсю моцу*
*Галёкаў нехта ў мікрафон:*
*— Хай будзе наш калгас багаты!*
*І хай жыве наш старшыня!*
*А дзермакраты-гарлахваты*
*Яму і блізка не раўня!*
*Крычаў прамоўца каля фермы:*
*— Кіроўца трэба не такі!*
*Калгас дабіў ён! І цяпер мы*
*Жывём, як тыя жабракі!*
*А ля канторы рэпрадуктар*
*Адчайны заклік той глушыў:*
*— Адзежы ўдосталь і прадуктаў!*
*Лафа для цела і душы!*
*Ля фермы цётка гаварыла:*
*— Над намі нейкі цяжкі рок...*
*А запярэчыш — дасць у рыла,*
*Яму — ні слова папярок.*
*А рэпрадуктар ля канторы*
*Заглушваў голас-боль жывы:*
*— Народ у нас не знае гора!*
*Свабоды мае і правы!*
*На сходзе выказалі людзі*
*Свае папрокі-жальбы ўсе*
*(Ну хто ж іх чуў і слухаць будзе?),*
*Дый разышліся пакрысе.*
*Якраз тады і ля канторы*
*Заціхлі раптам пахвалы.*
*Быў вельмі старшыня ў гуморы*
*І загадаў накрыць сталы.*
*Затым прыйшоў і час канцэрта,*
*Над вёскай песні паплылі:*
*Артысты з блізкага райцэнтра*
*Там "адпрацоўвалі" рублі.*
*Праз пару дзён пра мітынг гэты*
*На цэлых дзве старонкі аж*
*Надрукавала райгазета*
*Узнёслы, звонкі рэпартаж.*
*І абураўся люд мясцовы,*
*Свой гнеў выказвала сяло:*
*Пра сход народны там — ні слова,*
*Як быццам схода й не было.*

* * *

*Што ж гэта робіцца на свеце?*
*За што на люд такі цяжар?*
*На сходзе словы — як на вецер,*
*З трыбуны крык — на ўвесь абшар.*

З НАТУРЫ

## Размова з цёткай

Нядаўна быў у гасцях у цёткі. Размаўлялі пра палітычную барацьбу.

— Гэта для мужчын! — сказала цётка пра палітыку.

— Твой жа бацька быў у партыі Здаровага Сэнсу? — у адказ спытаў я.

— Сколькі ён там быў, паўгода! — адказала цётка.

— Як ставішся да беларускай мовы? — спытаў я.

— Мяне выхоўвалі на рускай! — адказала цётка.

— А як з украінскай? — спытаў я, бо яе маці ўкраінка.

— Жыла б ва Украіне, вывучыла б украінскую! — адказала цётка.

Усё гэта мне нагадвае размовы *"Калі б я быў у Амерыцы, я быў бы мільянерам!"*

Для мяне ж святая, Богам дадзеная зямля тая, дзе хадзіў мой дзед, ветэран вайны, дзе хадзіла бабуля-настаўніца, акцёр бацька. Святая зямля там, дзе хадзіў ветэран вайны, паэт і марак **Артур Вольскі**. Так, верш Артура Вольскага я і хацеў бы нагадаць:

*І ў дрэў бываюць наваселлі:*
*Вальней шуміце і ладней,*
*Хоць і не там, дзе вы хацелі,*
*А там, дзе людзям выгадней.*
*Ну, хто спытае ў дрэва згоду?*
*Абы давала ў летні дзень*
*Нам прахалоду*
*Ў насалоду,*
*Пад ногі выпрастаўшы цень.*
*Але ж усё-ткі ўлічваць трэба,*
*Іначай — божа барані:*
*Тады ўбярэцца ў сілу дрэва,*
*Калі ўцалеюць карані.*

**Сяргей НОРМАН,**
**літаратар.**

ПРОБЛЕМА!

# Не карать, а спасать

Борьба с продажей наркотиков по-белорусски. Все, как обычно у нас в стране. Президент сказал, что надо жестко бороться с торговлей наркотиками и ведь правильно сказал: "с торговлей", то есть с теми людьми, которые зарабатывают на этом огромные деньги. И тут я с ним, да, думаю, и любой человек, страдающий наркоманией, согласен.

Вот только незадача: президент сказал, МВД взяло под козырек — и давай бороться, доводить и увеличивать планы. А в регионах начинается такое!.. Не борьба, а, я бы сказал, побоище, от которого в разные стороны летят щепки человеческих судеб. Потому что на нары в 70 процентах случаев попадают не наркодилеры и представители организованной преступности, а больные люди, которыми они прикрываются и которые попали к ним в рабство из-за того, что стали наркозависимыми и ничего не могут с этим поделать. Ведь что такое наркомания? Мания — необузданное желание, влечение к чему-либо, не контролируемое человеком. Но вместо принудительного лечения в клинике, за которое в большинстве случаев готовы заплатить родственники, страна предлагает от 8 до 13 лет лишения свободы.

Оперативные сотрудники по борьбе с торговлей наркотиками в городах тоже попали в ловушку системы в борьбе за лучшие показатели раскрываемости. Им ничего не остается, как задерживать наркозависимых, ведь это легче и быстрее, потому как иначе могут лишить премиальных, а им тоже надо кормить свои семьи. Вот и стоят они перед нелегким выбором: разрабатывать, собирать доказательную базу на поставщиков (а на это уходит около полугода, а то и год), перебиваться с семьей и детьми на голом окладе или арестовать двух наркоманов, которые скинулись на "зелье" и один из них пошел покупать. Почему пошел один? Так наркоторговец ведь не дурак и толпы к себе не пускает. Дальше все идет по проверенной схеме. Покупателя и его друга по несчастью арестовывают. По закону получается, что один дал другому деньги, а тот ему взамен — наркотик. А это, господа присяжные заседатели, сбыт.

Нет, сотрудники милиции знают, что и как было, но ведь, с одной стороны, премия и сытые дети, а с другой — какой-то наркоман. И, морально себя успокоив, что наркоманы все воруют, поэтому пусть лучше сидят, склоняются в стороны сытых детей.

В нашем обществе сложилось мнение, что наркозависимые — это недочеловеки, моральные уроды, причем все поголовно. Это мнение сложилось "благодаря" нашим СМИ, которые показывают падших на самое дно наркотической пучины. И никому из окружающих не ведомы те, кто только вошел в воды этого страшного океана, их нет в статистике, они не стоят на учете. Они нормально живут, работают, у них семьи, дети, их еще можно спасти. Но вместо спасательного круга государство их топит в уголовном мире.



Представьте, какое бы сложилось о нас мнение у представителей мусульманского непьющего общества, если бы они судили о нас по людям, страдающим алкоголизмом, стоящим под каждым магазином. А ведь алкоголь, пусть разной крепости, по праздникам употребляет практически все взрослое население страны!

Поэтому, может, хватит бороться с наркозависимыми, а пора бы их лечить и возвращать обществу. Может, все-таки стоит найти деньги на строительство клиники для наркозависимых. Разработать методику лечения с малым (до 5%) рецидивом возвращения к употреблению. Думаю, за такое лечение даже наши соседи из разных стран платили бы немалые деньги, так что такая клиника окупилась бы в скором будущем. А самое главное — она бы вернула прежде всего белорусским семьям братьев, сыновей, мужей, дочерей, жен, которых они уже потеряли или начали терять и ничего с этим поделать не могут...

**Вадим ФИЛОНЮК.**

*г.п. Доманово.*

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

# Адчай

Лета паварочвала на восень. У канцы жніўня часта ішлі дажджы, і старая Вера Пякарнік усякі раз расстаўляла па хаце і сенцах вёдры і тазікі, бо шыфер на старой страсе быў як рэшата. Аднойчы яна пайшла да суседкі Вікці Куніцкай, у якой быў тэлефон, і пазваніла ў Мінск дачцэ:

— Ніна, няхай твой Толік прыедзе, заменіць мне некалькі лістоў шыферу на страсе, бо ўжо ніякіх сіл няма, гэтак цячэ...

— Слухай, маці! — абарвала яе дачка. — Па-першае, у Толіка работы па самае горла, а па-другое, пераязджай лепш да нас. Назусім. У трохпакаёвай кватэры месца хопіць. Ды і пенсія твая для нас лішняй не будзе: Аксана ва ўніверсітэт паступіла на платнае, Ігарок у сёмы клас пойдзе, расце не па днях, а па гадзінах, вопраткі ды абутку не напасешся.

Акурат першага верасня за Верай прыехаў на легкавіку зяць, забраў у горад разам з небагатымі пажыткамі. Хацела ўзяць дарагое: рамкі з фотакарткамі, вышываныя ручнікі, посцілкі-перабіранкі. Усё было ўжо прыгатавала ў дарогу, але Толік быў супраць:

— Ты што, з глузду з'ехала?! У нас сучасная кватэра, няма там месца тваёй старызне. Пакідай тут.

Як толькі пераступіла парог, грашам старой адразу ж знайшлося месца ў Ніным кашальку, а сумка з адзеннем так і засталася нераспакаванай, яе ўвапхнулі ў шафу ў прыхожай.

— Пакамечыцца ж, — спрабавала пярэчыць старэнькая маці, але Ніна лічыла інакш:

— Ну дык і што? Табе ж не на танцы хадзіць у тым убранні.

Ніна зморшчыла лоб, нібы глыбока задумалася, а потым выказала сваё рашэнне:

— Спаць будзеш на кухні, я табе раскладушку з антрэсоляў дастану. А як толькі раніцай зазвоніць гадзінік, каб хуценька ўсё прыбрала і схавала ў тую шафу, дзе адзенне тваё памясцілі. Толькі не марудзь, бо нам трэба паснедаць і бегчы па справах.

Гэта было сказана такім тонам, што Веру і сон не браў. З вечара, бывала, задрэмле, але з паўночы ўжо не спіць, чакае раніцы ў неспакоі і трывозе: а раптам не пачуе таго будзільніка і потым будзе замінаць радні, прыбіраючы пасцель пры іх. Ды і як тут заснеш, калі пад акном бясконца гудзяць машыны, у кватэры ад вулічнага ліхтара светла, як удзень. І мулка на раскладушцы, усе косці баляць. Але каму паскардзішся?

Работу дамашнюю рабіць ёй не дазвалялі і па вялікай трохпакаёвай даччынай кватэры яна сноўдацца баялася.

— У залу не хадзі, бо ад цябе старасцю смярдзіць, — загадала Ніна. — У нас госці бываюць, важныя людзі, не тое што ў тваіх занюханых Капачах. У нашай з Толікам спальні таксама сядзець няма чаго. Можаш да Ігарка ў пакой калі-нікалі зазірнуць, як дазволіць.

Але Ігарок не дазволіў. Калі бабуля аднойчы хацела разглядзець карцінкі на сценах у ягоным пакоі, малы накінуўся каршуном:

— Кацiся адсюль! Я музон урублю, а ты мне будзеш перашкаджаць!

— Унучак, чаго ты крычыш? Я ж цябе маленькага гадавала... І Аксанку... — са старэчых вачэй бобам пакаціліся слёзы

— А я цябе прасіў? Гадавала... Маленькага... — перадражніў унук.

Ёй можна было знаходзіцца толькі на кухні. І старэнькая цэлымі днямі глядзела ў акно, баялася, каб не звар'яцець без занятку і той непрыязнасці ў даччынай сям'і.

Дачка паклапацілася перавесці мацерыну пенсію па новым адрасе, і цяпер усялякі раз, як толькі паштальёнка прынясе грошы, забірала ўсё да рубельчыка.

— Пакінула б хоць мне крыху, — нясмела папрасіла маці.

— А навошта? Ты ж з дому не выходзіш, сядзіш на ўсім гатовым.

Бабуля Вера адпакутавала ўсю восень і зіму, а ў канцы лютага вырашыла, нікому нічога не кажучы, уцячы ў сваю вёску. Там жыла яе сястра Рэня.

— Не прагоніць жа мяне, — разважала няшчасная. — Я ёй столькі ў жыцці дапамагала, і мой Сымон, як жывы быў, таксама.

Рэня была старой дзеўкай і жыла адна. На яе была ўся надзея.

У той дзень, калі паштальёнка прынесла пенсію, дома нікога не было. Паклаўшы грошы ў паношаны кашалёк, Вера ўзяла ў шафе сваю сумку і накіравалася на аўтавакзал. Вольная, шчаслівая, як птушка, што вырвалася з клеткі, праз тры гадзіны яна была ўжо ў сваіх дарагіх Капачах. З болем заўважыла, што страха роднай хаты прагнулася, нібыта ад вялізнага цяжару.

— За восень і зіму кроквы прагнілі, вядома ж, даўно няма гаспадара, — шаптала засмяглымі вуснамі.

Рэніна хата была якраз насупраць. Ззяла чыстымі вокнамі, бялюткімі фіранкамі. Забрахаў сабака, і гаспадыня выйшла на ганак.

— Во, і госця няпрошаная з'явілася! І чаго табе ў горадзе не жылося, у цяпле седзячы ды булкі свежыя ядучы? — "прылашчыла" сястру.

— Не ў госці я, Рэнечка, — заплакала Вера. — Каб табе тых булак, якіх я ела, век не каштаваць... Пусці дажыць астатак дзён, дасць Бог, нядоўга ўжо засталося.

— А ты ж усё казала, што, маўляў, калі ў мяне дзяцей няма, то ў старасці будзе дрэнна. Аказваецца, табе з дачкой яшчэ горш, чым мне, самотнай. — Яна прапусціла на веранду сястру, але загадала:

— Разувайся, бо ў мяне чыста.

"І тут камандуюць", — міжволі падумала Вера, але прамаўчала: добра, што сястрыца не прагнала зусім.

Ужо познім вечарам, калі яны збіраліся класціся спаць, ля Рэніных варот спынілася машына. Праз нейкае імгненне ў дзверы пастукалі:

— Адчыні, цётка Рэня! — пачуўся з ганка голас Ніны. — Маці сюды прыблукала, ці дзе яшчэ яе халера дзела?

Увайшла, убачыла на ложку Веру ў начной сарочцы. Тая са страхам глядзела на дачку: зноў у горад павалачэ. На пакуты...

— Паехаць то ты паехала, ну і хай. А чаму пенсію за люты з сабой папёрла? Ты ж цэлы месяц у мяне жыла, піла-ела.

— А ў мяне тут што, багадзельня?! — уз'юшылася і Рэня. — Я таксама без пенсіі не прыму. За душой ні капейкі, а яна села на маю шыю? На сацыяльны ложак здам, няхай там даглядаюць.

— Добра, Рэнечка, на сацыяльны ложак. Толькі не крычы. А пенсію маю за люты бярыце. — Старэнькая патупала босымі нагамі да парога, дзе на цвічку вісела яе паліто, дастала кашалёк, паклала грошы на стол:

— Дзяліце.

І дачка, і сястра, нібы клешч у скуру, упіліся позіркамі ў кучку купюраў, потым Рэня пералічыла грошы.

— Пяцьсот тысяч дваццаць рублёў, — аб'явіла пляменніцы. — Як думаеш, не ўтаіла?

— Не ўтаіла, — пацвердзіла тая. — Яна крыху больш атрымлівае, але на дарогу патрацілася.

— Табе дзвесце тысяч, а мне трыста, бо яшчэ невядома, калі афармлю яе на сацыяльны ложак, — вырашыла Рэня і аддала пляменніцы дзве соценныя купюры. Тая, згробшы грошы ў жменю, бразнула дзвярыма, нават не глянула на маці, не развіталася.

Бабульку Веру апанаваў адчай. Яна, накрыўшыся коўдрай з галавой, горка плакала. За ноч, што называецца, і вокам не звяла, а калі за вокнамі пачало днець, пацiху апранулася і пабрыла на свой надворак. Адчыніла дзверы ў адрыну і намацала там на кручку вяроўку.

Для вяскоўцаў выміраючых Капачоў доўга заставалася таямніцай яе жудасная смерць. А потым Рэня пра ўсё распавяла суседцы, бо, казала, яе надта мучыў грэх...

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.**

*Дзятлаўскі раён.*

МНЕНИЕ

## Забыли о совести

Хочу высказаться по поводу низкой политической активности и нежелания белорусов бороться за свои права.

Безумство храбрых должно быть, и честь таким людям и слава. Но лозунги, под которыми идет борьба за перемены, явно устарели. Оппозиция пытается в очередной раз проиграть заезженную пластинку с привычным набором "Братство, равенство, свобода". К чему это приводит, народ великолепно знает.

1917 год. Братание с немцами — развал России.

1937 год. Равенство — в ГУЛАГе действительно равны были все, кто там оказался.

1991 год. Свобода — Ельцин забрался на танк и очень ловко отфутболил ее олигархам.

Так есть ли смысл доверять захватанным грязными руками достойным словам? Полагаю, нет. И народ на подсознательном уровне это очень тонко чувствует. Кто-то судорожно держится за власть, а кто-то хочет ее получить, чтобы делать то же самое под теми же лозунгами. Европа не идеал для подражания, социальные государства заботятся о своих гражданах не столько из гуманности, сколько в целях внутренней безопасности и спокойствия. Правда, переборщили с арабами, пригласив их на ПМЖ и гарантировав социальные права. Похоже, этот популизм их и погубит, как Советский Союз погубило воровство и помощь в экспорте социализма в африканские, латиноамериканские и прочие страны.

Воровство в "социальном" государстве стало нормой, но все такие режимы в конечном счете терпят крах и позор — перед нашими глазами Бакиев, Мубарак, Каддафи, на подходе Башар Асад. Так что, будем и дальше подставлять свои щеки? Или все же начнем думать о жизни по совести?

Не пора ли появиться простой национальной идее — "Жить по совести"? Почему-то эта основополагающая ценность жизни замалчивается.

Совесть — единственный всеобъемлющий закон, дающий достойную жизнь! А это значит — менять привычки и психику.

Перестать бояться труда.

Стремиться к знаниям.

Перестать все помыслы тратить на приобретение денег.

Перестать бояться говорить правду.

Перестать юлить, подстраиваться под сильного.

Перестать жалеть негодяев.

Под силу ли это нам? Если нет — значит, время еще не пришло, будем "созревать".

**А.Л.БЫЧКОВ,**
**капитан 2-го ранга запаса.**

КОРОТКО

## США: «Концерт надежды»

Два столба света на месте, где стояли башни-близнецы: световым шоу Америка завершила День скорби по жертвам событий десятилетней давности.

Самые масштабные в истории террористические акты унесли жизни почти трех тысяч человек.

Президент США Барак Обама заметил: за минувшие десять лет американцы доказали, что их волю не сломить даже подобными трагедиями. "Сегодня стоит вспомнить и о том, что не изменилось: не изменился наш национальный характер, не ослабла наша вера — в Бога и в самих себя".

Кульминацией Дня памяти стал "Концерт надежды" в столичном Кеннеди-центре: стихи и музыка в память о трагедии в исполнении коллективов и музыкантов со всей страны.

## В Вене вчера открылось заседание Совета управляющих МАГАТЭ

Среди главных тем обсуждения — ядерная программа Ирана, который западные страны подозревают в попытках создать ядерное оружие, и авария на японской атомной электростанции "Фукусима-Дайичи" после землетрясения и цунами 11 марта.

Члены Совета управляющих МАГАТЭ рассмотрят также план усиления мер безопасности на предприятиях атомной отрасли, чтобы не допустить в дальнейшем новых утечек радиации, как это произошло после стихийного бедствия в Японии.

## На АЭС «Маркуль» во Франции произошел взрыв

Как передает Europe 1 со ссылкой на представителей Комиссариата по атомной энергетике Франции, в результате инцидента один человек погиб, четыре пострадали, сообщается об одном пропавшем без вести. По данным Le Figaro и ряда других источников, на АЭС существует риск утечки радиации.

## Кэмерон в Москве отбивался от вопросов британской прессы

